ІНФАРМАЦЫЙНЫ БЮЛЕТЭНЬ
Кніга ноша
№ 45
жнівень, 2017
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: ГА"САЮЗ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ", МГА"ЗБС"БАЦЬКАЎШЧЫНА"

**АЎТОГРАФ**

## Зміцер БАРТОСІК:

# «Уразіла адкрытасць людзей, іх смеласць...»

**– Шаноўны Зміцер Валер’евіч, Вашая кніга «Быў у пана верабейка гаварушчы» прэзентавалася ў шматлікіх гарадах Беларусі і мае шалёны поспех у чытачоў, атрымала прэмію імя Аляксандра і Марыі Стагановічаў. Вы самі чакалі такой цікавасці да гэтай кнігі?**

– Не чакаў. Але ж спадзяваўся. Бо многія эпізоды гэтай кнігі ніколі не адлюстроўваліся ў мастацкай літаратуры. Пра такое за Саветамі нават гаварыць было небясьпечна.

**– Што найбольш уразіла Вас пад час вандровак для перадачы «Падарожжы Свабоды»? Якую мясціну ў Беларусі Вы параілі б наведаць нашым чытачам?**

– Уразіла адкрытасць людзей. Іх смеласць у расказах пра падзеі Другой сусветнай, якая для многіх маіх суразмоўцаў была не сусветнай, а міжсуседскай вайной. Ад гэтага не менш страшнай. Наконт мясціны... Найперш варта з’ездзіць да Паўстанцкага крыжа ў вёсцы Слабодка, на Астравеччыне, пастаўленага па ініцыятыве Алеся Юркойця. Самы моцны помнік палеглым каліноўцам.

**– Вы шмат ездзіце па Беларусі, часты госць на творчых сустрэчах, літаратурных імпрэзах? Якія пытанні найчасцей задаюць Вам пад час сустрэчаў?**

– Самае частае пытанне – як я, расеец, стаў беларусам. На якое мне адказаць вельмі лёгка. Я ж не маю комплексу, якім хварэлі дзеці 1960-х і 1970-х гадоў. Дзеці, якія пераехалі з вёскі ў горад. Я пераехаў з расейскага горада ў беларускі горад. І для мяне беларуская мова мела налёт іншаземнасці, а не «калхознасці».



фота www.svaboda.org.

**– Вы вядомы найперш як бард, але ў 2002 годзе выдалі кнігу апавяданняў «Чорны пісталет». Ці працягваеце Вы пісаць прозу? Распавядзіце, калі ласка, пра Вашыя творчыя планы.**

– Я ніколі не збіраўся «пісаць прозу». Я пісаў спачатку для «Нашай Нівы», пасля для «Вострай Брамы» свае эсэ і назіранні, з якіх і склаўся «Чорны пісталет». Цяпер я перарабляю і перапісваю свае старыя тэксты для кнігі «Забыты адрас». Мне здаецца, гэтая кніга будзе не менш цікавай за «Верабейку». Хоць і не такой драматычнай.

**Даведка «Кніганошы»:**

**Зміцер Бартосік – бард, пісьменнік. Аўтар кніг «Чорны пісталет» (2002), «Быў у пана верабейка гаварушчы...» (2016). Нарадзіўся 1969 г. Рыбінску (Расія). Пераехаў у Гомель, калі ўжо быў трэцякласнікам. Жыве ў Мінску.**

# ■ МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА




**Паўлікава-Хейдарава Людміла. Прыступкі да Храма Святога Духа: вершы. Фат. В. Ягораў. – Мінск: Галіяфы, 2017. – 404 с.: фат. – (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка»; вып. 90).**

Філасофская, грамадзянская, рэлігійная, пейзажная і любоўная лірыка, балады, санеты, паэмы, пераклады з сучаснай літоўскай, украінскай, рускай, польскай, в'етнамскай паэзіі, а таксама з рускай паэзіі Аляксандра Пушкіна, Міхаіла Лермантава, паэтаў Сярэбранага веку Ганны Ахматавай, Барыса Пастарнака, Марыны Цвятаевай, Восіпа Мандэльштама, Максіміліяна Валошына. Кніга новых вершаў і выбранага са зборнікаў ранейшых часоў – вынік сталага мастацкага і духоўнага пераасэнсавання паэтэсай яе творчага шляху на працягу 35 гадоў.




**Дранько-Майсюк Леанід. «...Натуральны, як лінія небасхілу»: архіўная аповесць пра Максіма Танка. – Мінск: Кнігазбор, 2017. – 148 с., XXIV с. іл. – (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка»; вып. 97).**

Паэт Леанід Дранько-Майсюк выступіў у дакументальным жанры, напісаў архіўную аповесць «...Натуральны, як лінія небасхілу». Гэта твор пра беларускага песняра Максіма Танка (1912–1995), пра той час (першая палова 1930-х гадоў), калі малады Максім Танк жыў у Вільні, супрацоўнічаў з падпольнымі структурамі Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, калі за ім навадам хадзілі агенты дэфензівы і ягонае пашпартнае імя (Яўген Скурко) вельмі часта з'яўлялася ў паліцэйскіх рапартах і пратаколах допыту, у пракурорскіх абвінаваўчых актах і судовых пастановах.

Аповесць «...Натуральны, як лінія небасхілу» – вынік шматгадовай працы ў віленскіх і мінскіх архівах.




**Грыб Тамаш. Выбранае: Уклад., уступ. слова Наталлі Гардзіенкі, Лявона Юрэвіча; камент. Андрэя Бучы, Наталлі Гардзіенкі, Лявона Юрэвіча; бібліяграфія Андрэя Бучы. – Мінск: Кнігазбор, 2017. – 476 с., [8] с. іл. – (Бібліятэка Бацькаўшчыны; кн. 32).**

Першая кніга падсерыі «Спадчына: агледзіны» серыі «Бібліятэка Бацькаўшчыны» Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына» ўяўляе сабою складзены ўпершыню ў гісторыі зборнік выбраных прац грамадскага дзеяча, раднага БНР, публіцыста, архівіста Тамаша Грыба. У выданне ўвайшлі як найбольш значныя і вядомыя публікацыі аўтара, гэтак і тэксты ды ліставанне, што не публікаваліся пры яго жыцці. У кнізе можна таксама прачытаць сведчанні сучаснікаў пра Тамаша Грыба і знайсці яго бібліяграфію. «Выбранае» Тамаша Грыба шырока і разнастайна прадстаўляе інтэлектуальную спадчыну дзеяча, маючы на мэце вяртанне яго даробку ў айчынны філасофскі і гістарычны дыскурсы.




**Самойла Уладзімір. Выбранае. Уклад., падрыхтоўка тэкстаў, уступ. слова, агульнае рэдагаванне Наталлі Гардзіенкі, Лявона Юрэвіча; камент. Наталлі Гардзіенкі, Аляксандра Пашкевіча, Лявона Юрэвіча. – Мінск: Кнігазбор, 2017. – 288 с.: [4] с. іл. – (Бібліятэка Бацькаўшчыны; кн. 34).**

Кніга «Выбранае» Уладзіміра Самойлы – другая ў падсерыі «Спадчына: агледзіны» серыі «Бібліятэка Бацькаўшчыны» Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына» – гэта складзены ўпершыню зборнік працаў апекуна Янкі Купалы, выдатнага літаратурнага крытыка і філосафа. У выданне ўвайшлі рэцэнзіі на зборнікі Янкі Купалы, Казіміра Сваяка, Наталлі Арсенневай, перыёдыкі і асобныя творы аўтараў 1920–1930-х гг. Таксама ў кнізе можна знайсці філасофскія эсэ, у тым ліку найбольш важнае «Гэтым пераможаш!», некаторыя лісты Уладзіміра Самойлы, публікацыі, прысвечаныя яго біяграфіі і творчасці, ды інтэрв'ю з сынам дзеяча. Выданне рэпрэзентуе малавядомую сёння, але багатую і разнастайную творчую спадчыну выдатнага беларускага інтэлектуала.




**Снарская Іна. Вогнепаклонніца: паэзія. – Мінск: Кнігазбор, 2017. – 164 с. – (Бібліятэчка часопіса «Дзеяслоў» вып. 20).**

«Вогнепаклонніца» – восьмая кніга паэткі, якая жыве ў Палтаве і творыць на беларуска-ўкраінскім бязмежжы. Гэта кніга пра любоў, любоў маладую і сталую – да свайго карэння, роднай зямлі, дарагіх людзей і ўсяго жывога. З дапамогай ранішняга, па-дзіцячаму светлага вобразу Іна Снарская раскрывае сваю «агнявую», сонечную натуру, дзе, нягледзячы на ўсе выпрабаванні лёсу, яна застаецца вернай парадам дзедакаваля: «Паддай агню, не падай духам, Іна, / І кожны дзень прымай, як адкрыццё».




**Нурдквіст Свэн. Фіндус з'язджае. Мастак Свэн Нурдквіст; пераклад са шведскай Надзеі Кандрусевіч. – Мінск: Кнігазбор, 2017. – 36 с.: іл. – (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка». Падсерыя «Каляровы ровар»; выпуск 17).**

Пэтсан стаміўся ад таго, што коцік Фіндус пачынае скакаць у сваім ложку а чацвёртай раніцы. Стары папярэдзіў Фіндуса, што калі той не перастане яго будзіць, то ім давядзецца перанесці ложачак Фіндуса са спальні ў якое-небудзь іншае месца. Спачатку Фіндусу вельмі спадабалася гэтая ідэя: ён жа зможа скакаць у ложку колькі заўгодна!

Аднак ці так ужо весела жыць аднаму? Можа, гэта трохі небяспечна? А раптам прыйдзе ліс?

**Бэргстрэм Гуніла. Суперкніга пра Біла з Болаю (Біл разумны, а Бола вясёлая). Мастак Гуніла Бэргстрэм; пер. Андрэя Хадановіча, падрадкоўны пер. са швед. Алесі Башарымавай і Надзі Кандрусевіч. – Мінск: Кніга-**




**збор, 2017. – 68 с.: іл. – (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка». Падсерыя «Каляровы ровар»; вып. 18).**

Кніга пра Біла і Болу шведскай дзіцячай пісьменніцы і мастачкі Гунілы Бэргстрэм распавядае кранальную гісторыю пра тое, як у звычайнай сям'і з'яўляецца незвычайная дзяўчынка. Што нясе з сабой нараджэнне асаблівага дзіцяці – радасць ці гора? Ці нашае жыццё ды ўсё, што ў ім адбываецца, – суцэльная неспадзяванка ды найвялікшы цуд?




**Скобла Міхась. Высьпятак ад Скарыны. (Бібліятэка Свабоды. XXI стагодзьдзе). – Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2017. – 500 с.: іл.**

Кнігі не толькі маюць свой лёс, яны могуць кіраваць лёсамі сваіх аўтараў. Кнігі, вартыя, каб іх прачыталі мільёны, і заслугоўваючыя аўтадафэ, кнігі – як абарончы мур і кнігі-касманаўты, кнігі – помнікі каліграфіі і ахвяры цэнзуры, Кніга над кнігамі – Біблія – у сваім першародным выглядзе – вось галоўныя «героі» гэтага выдання, прымеркаванага да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання.




**Малая падарожная кніжка. Версія 2.0. Пераклад са старажытнаяўрэйскай і старажытнагрэцкай моваў Антонія Бокана. – Мінск: Пазітыў-цэнтр, 2017. – 160 с.**

Першая друкаваная кніга на тэрыторыі нашай краіны з'явілася ў 1522 г. у Вільні. Яе надрукаваў Францыск Скарына, і называлася яна «Малая падарожная кніжка». Невялікага памеру кніга прызначалася для падарожнікаў, якія ў часе доўгай дарогі чытаюць Псальмы і ўзносяць спевы і малітвы на славу Госпада. «Малая падарожная кніжка. Версія 2.0» надрукаваная ў XXI стагоддзі. Але яе прызначэнне такое самае, як і ў яе папярэдніцы 500 гадоў таму – даць магчымасць на кожным месцы чытаць Пісанне і ўзносіць малітвы Госпаду. У гэтай кніжцы змешчаныя Евангелле паводле Марка і Кніга Прыповесцяў Саламона, а таксама 4 раздзелы з Евангелля паводле Лукі і 15 найбольш папулярных псальмаў.




**Зізюк Міхась. Планктон: аповесці, нарысы, апавяданні. Мінск: Галіяфы, 2017. – 400 с.**

У чарговай кнізе сучаснага беларускага пісьменніка Міхася Зізюка знойдуцца творы для аматараў самых розных жанраў: прыгодніцкай і містычна-фантастычнай аповесці, псіхалагічнага апавядання, вандроўна-падарожных нарысаў… Але ўсе гэтыя творы аб'ядноўвае шчырая любоў да чалавека, прыроды, роднай зямлі.




**Прус Баляслаў. Лялька: раман. – Мінск: Выдавец Уладзімір Сіўчыкаў, 2017. – 370 с.**

Знакаміты раман Баляслава Пруса (1847–1912) «Лялька» – гэта эпічная панарама варшаўскага жыцця канца 70-х гадоў XIX стагоддзя са шматлікімі рэмінісцэнцыямі з часоў паўстанняў 1830–1831, 1848 і 1863–1864 гадоў.

Былы шляхціц, а цяпер купец Вакульскі закахаўся ў збяднелую арыстакратку – панну Ізабэлу. Каханне актывізуе магутную энергію галоўнага героя, дадае яму сілы, і Вакульскі, па волі аўтара, робіцца такой заможнай і ўплывовай асобаю, што арыстакраты прымаюць яго ў сваіх салонах, а ганарліўка панна Ізабэла, хоць і пагарджае нуварышам, усё ж пагаджаецца выйсці за яго замуж... Першапублікацыя рамана адбылася ў 1887–1889 гадах, кнігамі перавыдаваўся ён шматразова, а ў перакладзе на беларускую мову выходзіць упершыню.




**Камоцкі Алесь. Забірай маё лета: вершы. Фат. В. Грудзько. – Мінск: Галіяфы, 2017. – 94 с.: фат.**

Новую кнігу вядомага барда і паэта Алеся Камоцкага склалі вершы, напісаныя ў 2012–2014 гг. праілюстраваныя фотаздымкамі Вадзіма Грудзько.




**Кутузаў Максім. Князь-ваўкалак: прыгодніцка-гістарычны раман. – Мінск: Галіяфы, 2017. – 276 с.**

Людзі звычайна думаюць, што жыццё князя прыемнае і бесклапотнае. Аднак ці яно такое на самой справе? Ці можна назваць бесклапотным жыццё, калі пагроза варожага мяча і здрадніцкага кінжала заўсёды побач? Калі нельга быць упэўненым у тым, хто з'яўляецца сябрам, а хто толькі робіць выгляд?.. Ці можна назваць прыемным жыццё, калі ты ім не валодаеш? Калі ты не можаш зрабіць ніводнага кроку без згоды тваіх дарадчыкаў? Жыццё князя можа быць і вельмі цікавым ды насычаным, калі яму пашанцавала і ён нарадзіўся ваўкалакам. У гэтым выпадку перад ім адкрываюцца зусім іншыя магчымасці. Галоўнае – ведаць, як імі скарыстацца…




**Холер Франц. Каменны патоп: навела. Пер. з ням. І. Герасімовіч. – Мінск: Галіяфы, 2017. – 174 с.**

У нядзелю, 11 верасня 1881 года, швейцарская вёсачка Эльм, што ў кантоне Гларус, пацярпела ад страшэннага камняпаду, выкліканага парушэннем тэхналогіі здабычы шыферу. Франц Холер расказвае пра два апошнія дні перад катастрофай, апісваючы іх з перспектывы сямігадовай Катарыны Дыш, дзяўчынкі, якая вельмі тонка адчувае свет, што робіць яе жыццё дужа нялёгкім, але ўрэшце і ратуе.




**Севярынец Ганна. Дзень Святога Патрыка: раман. – Мінск: Регистр, 2017. – 236 с.**

Эксперт міжнароднай моўнай камісіі Марына Дамейка прымае рашэнне прызнаць беларускую мову мёртвай, і зараз ёй патрэбна захаваць у спецыяльным архіве тое мастацтва, якое было створана на гэтай мове. Што яна паставіць на паліцы спецхрану? Каго назаўжды выкіне з гісторыі? Якім чынам на мёртвай мове можна будзе зарабіць мільярды даляраў? Ці з'явіцца ў памерлай мовы шанец? Гісторыя любові – да мужчыны, да літаратуры, да краіны – якая, на жаль, не можа скончыцца добра.




**Ваданосава Кацярына. Міфатворчасць: зборнік вершаў. – Мінск: А.М. Янушкевіч, 2017. – 96 с.**

«Міфатворчасць» – першы вершаваны зборнік Кацярыны Ваданосавай. У ім маладая паэтка імкнецца паяднаць рэаліі штодзённага жыцця з міфічным светам сваіх вершаваных кроз, перакладаючы музыку душы на музыку паэтычнага гучання...




**Лаўкрафт Говард Філіпс. Кліч Ктулху: апавяданні. Пер. з англ. У.В. Гурыновіч, П.П. Донава, А.Ю. Кудраўцава. – Мінск: А.М. Янушкевіч, 2017. – 280 с. – (Бібліятэка часопіса «ПрайдзіСвет» «PostScriptum»).**

Говард Філіпс Лаўкрафт (1890–1937) – амерыканскі пісьменнік, аўтар твораў у жанрах жахаў, містыкі і фэнтэзі, якія пасля яго смерці зрабіліся культавымі і істотна паўплывалі на сучасную літаратуру жахаў. Творчасць Лаўкрафта настолькі ўнікальная, што даследчыкі выдзяляюць асобны паджанр – лаўкрафтаўскія жахі. У кнігу ўключаныя такія знакамітыя апавяданні аўтара, як «Кліч Ктулху» , «Пацукі ў сценах», «Стоены жах», «Ганчак» і многія іншыя творы з розных перыядаў творчасці.




**Морт Вальжына. Эпідэмія ружаў. – Вільня: Логвінаў, 2017. – 100 с.**

«Эпідэмія ружаў» – не проста кніга, пад вокладкай якой сабраныя старыя і новыя вершы Вальжыны Морт. Гэта чарадзейны сад, дзе побач растуць боль і радасць, любоў і вусціш, жорсткасць і меланхолія. Сад, у якога няма агароджы, сад, дзе валадараць цені і дзе кожны сам за сябе. Аўтарка пашырае не толькі межы мовы – праз гэтую паэзію сам свет выяўляе сваю бясскрайнасць. Аднак, нягледзячы на гэта, чытач трымае ў руках вельмі беларускую кнігу. «Эпідэмія ружаў» – у пэўным сэнсе вяртанне Вальжыны да нашага чытача. Вяртанне вельмі своечасовае і важнае.




**Шэйнэрт Малгажата. Насыпаць горы: палескія гісторыі. Пер. з польскай Марыі Пушкінай, Алены Пятровіч. – Вільня: Логвінаў, 2016. – 516 с.**

На пачатку XXI стагоддзя Малгажата Шэйнэрт выпраўляецца балотным шляхам на пошукі слядоў затопленай Пінскай флатыліі ды зніклага Герадотавага мора, адведвае герояў розных нацыяў, статусаў і часоў. Сярод іх беларускі палітык і польскі сенатар Раман Скірмунт, забіты ў сваім маёнтку; Напалеон Орда, дакументаліст амаль ужо страчанага свету замкаў, палацаў і святыняў; вязень сталінскіх лагераў Казімір Свёнтак, які пазней, ужо ў часы свайго кардынальства, выбраў сабе ўбогае жытло на самай гразкай вуліцы Пінска; Рахіль Вейцман з Мотале, маці першага Прэзідэнта Ізраіля і бабка сёмага. Шэйнэрт завітвае таксама ў хаты да шараговых палешукоў – тых, хто жыве далёка ад вялікай палітыкі, сцеражэ сваіх багоў і свае мовы, верыць, што яшчэ можна ўратаваць знішчанае.




**Навасельцава Ганна. І чарам сніцца чалавек: міфалагічныя апавяданні. – Віцебск: Віцебская абласная друкарня, 2016. – 272 с.**

Кніга складаецца з шэрагу міфалагічных апавяданняў, якія раскрываюць чароўны свет замоваў, паданняў, казак, дзе маўлівыя незвычайныя стасункі паміж чалавекам і прыродай, дзіўныя здарэнні і чарадзейныя выпрабаванні. Галоўныя героі – міфалагічныя істоты, боствы старажытных славянаў, легендарныя персанажы – маюць містычнае паходжанне ці надзеленыя выключнымі якасцямі.




**Бруй Уладзімір. Трэцяя Бярэзіна: аповеды з жыцця, аповесць. – Брэст: ААТ «Брэсцкая друкарня», 2016. – 248 с.**

Галоўная тэма кнігі – паводзіны ды ўзаемаадносіны людзей у абставінах, якія прымушаюць рабіць жыццёвы выбар, а часам пазбаўляюць магчымасці на яго. Шырыня кругагляду аўтара, яго шчырае стаўленне да лёсу герояў сваіх твораў, уменне пільным вокам назіраць за падзеямі і добрай роднай мовай распавядаць пра іх, а яшчэ адкрытае дэклараванне сваіх жыццёвых прынцыпаў выклікаюць жывую цікавасць і давер да аповедаў і аповесці.




**Багдзевіч Інеса. Кірмаш на клумбе: вершы і казкі для дзяцей. – Мінск: А.М. Вараксін, 2017. – 148 с.**

Кніга для чытання дома, у дзіцячым садку і школе. Асноўная мэта – развесяліць малых і падбадзёрыць старэйшых. Кніга знаёміць дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту з правіламі бяспекі жыцця, культурай паводзінаў, светам прыроды. Вучыць працавітасці і чалавечнасці, развівае беларускае маўленне.




**Гардзіенка Наталля, Юрэвіч Лявон. Хронікі БІНіМу: Гісторыя Беларускага інстытуту навукі і мастацтва ў дакументах, лістах і ўспамінах. Прадм. В. Кіпель. – Мінск: Кнігазбор, 2017. – 352 с.: іл. (Бібліятэка Бацькаўшчыны; кн. 33).**

Кніга Наталлі Гардзіенкі і Лявона Юрэвіча «Хронікі БІНіМу» – 33-я ў серыі «Бібліятэка Бацькаўшчыны» – прысвечаная 65-гадовай гісторыі Беларускага інстытута навукі і мастацтва ў Нью-Ёрку. Пра дзейнасць адной з найстарэйшых існых сёння эміграцыйных інстытуцыяў распавядаюць лісты, успаміны, пратаколы і іншыя дакументы з архіваў двух старшыняў – Вітаўта Тумаша і Вітаўта Кіпеля. Праблемы і дасягненні БІНіМа, умовы працы і роля асобаў – усё гэта знайшло сваё адлюстраванне ў кнізе, дапоўненай бібліяграфіяй альманаха «Запісы» і біяграфічным даведнікам.




**Шыдлоўскі Кастусь. Васковыя таблічкі: погляд на мінулае і будучыню. – Мінск, Кнігазбор, 2017. – 224 с.**

Кніга распавядае пра захапляльную гісторыю аднаго з найстаражытнейшых пісьмовых матэрыялаў, ужываных чалавецтвам, які шырока выкарыстоўваўся і нашымі продкамі. У ёй асветлены малавядомыя старонкі з гісторыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Беларусі, што разглядаюцца ў агульнаеўрапейскім кантэксце. Выданне разлічана на шырокае кола чытачоў, у ім выкарыстаны ілюстрацыі з архіва аўтара.




**Кухмістр Верашчака. Сакатала бочачка: праўдзівая гісторыя нашых напояў. – Мінск: А.М. Янушкевіч, 2017. – 208 с.: іл. – (Серыя «Шляхецкая чытанка»).**

«Сакатала бочачка» – новая кніга вядомага спецыяліста ў галіне кулінарнай справы Алеся Белага (Кухмістра Верашчакі), зборнік нарысаў, прысвечаных гісторыі самых знакавых алкагольных напояў Беларусі. У большасці выпадкаў – цалкам забытых, адкінутых таталітарным дваццатым стагоддзем як «чужынскія». Аўтар імкнецца вярнуць забытыя традыцыі ў кантэкст сучаснасці. Перад вамі – унікальны ілюстраваны даведнік, надзейная крыніца ведаў і вобразаў у «пікантнай» і зусім мала знанай галіне айчыннай гісторыі і культуры.

**Падалінскі Уладзімір. Прадстаўніцтва Вялікага Княства Літоўскага на Люблінскім сойме 1569 года: удзел у працы першага вальнага сойма Рэчы Паспалітай. Навук. рэд. А.А. Радаман. – Мінск: А.М. Янушкевіч, 2017. – 240 с.**




Манаграфія беларускага гісторыка Уладзіміра Падалінскага прысвечана дзейнасці і персанальнаму складу прадстаўніцтва Вялікага Княства Літоўскага на Люблінскім сойме ў ліпені–жніўні 1569 г. У кнізе аналізуюцца соймавыя дыскусіі і рашэнні па вызначэнні дзяржаўна-прававога статусу ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай, забеспячэнні абароны краіны, вырашэнні мясцовых і асабістых справаў. Упершыню робіцца спроба стварыць калектыўны партрэт вялікакняскіх сенатараў і земскіх паслоў, якія ўдзельнічалі ў працы сойма 1569 г. у Любліне. Разглядаецца праблема існавання ў ВКЛ самастойнага палітычнага руху дробнай і сярэдняй шляхты.




**Лаўрэш Леанід. Маламажэйкаўская царква: гістарычны нарыс. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2017. – 114 с.: іл.**

У кнізе, грунтуючыся на шматлікіх друкаваных і архіўных матэрыялах, распавядаецца пра шматсотгадовую гісторыю аднаго з унікальных храмаў Беларусі – Маламажэйкаўскай (Мураванкаўскай) царквы. У дадатку прыводзяцца дакументы і матэрыялы XVI–XX стст. па гісторыі царквы. Кніга прызначана для чытача, які цікавіцца беларускай мінуўшчынай: настаўнікам і вучням агульнаадукацыйных школаў, краязнаўцам, навукоўцам, выкладчыкам гісторыі і студэнтам.




**Арлоў Уладзімір. Кандрат Крапіва: Той, хто смяяўся апошнім. – Мінск: «Харвест», 2016. – 64 с.: мал. – (Серыя «100 выдатных дзеячаў беларускай культуры»).**

Кандрат Крапіва (сапр. К. Атраховіч; 1896–1991) – выдатны паэт-сатырык, драматург, перакладчык, мовазнавец, грамадскі дзеяч. Драматургія Крапівы адыграла вялікую ролю ў развіцці беларускага тэатральнага мастацтва. Акадэмік АН БССР (1950), народны пісьменнік Беларусі (1956), заслужаны дзеяч навукі БССР (1978). У 1956–1982 гг. віцэ-прэзідэнт АН БССР. Лаўрэат дзяржаўных прэміяў СССР 1941 і 1971 гг., прэміі імя Янкі Купалы (1974).




**Міронава Леніна. Мікалай Селяшчук: Добры чараўнік з Беларусі. – Мінск: «Харвест», 2016. – 64 с.: мал. – (Серыя «100 выдатных дзеячаў беларускай культуры»).**

Мікалай Селяшчук (1917–1996) – выбітны графік і жывапісец. Яго працам уласцівы зварот да матываў беларускага фальклору і складанасць сюжэтнага вырашэння ў спалучэнні з алегорыяй, метафарай, сімвалам. Галоўная тэма творчасці – родная зямля і яе насельнікі, успрынятыя праз прызму народных легендаў, паданняў і казак.




**Пінчук Міхась. Лявон Дубейкаўскі: Дойлід нацыянальнага стылю. – Мінск: «Харвест», 2016. – 64 с.: мал. – (Серыя «100 выдатных дзеячаў беларускай культуры»).**

Лявон Вітан-Дубейкаўскі (1867–1940) – архітэктар і будаўнік, грамадскі дзеяч і педагог. Ён вядомы сваімі праектамі і пабудовамі прамысловых і жылых будынкаў, касцёлаў і цэркваў. Менавіта Л. Дубейкаўскі першым пачаў ствараць нацыянальны стыль у беларускай архітэктуры.




**Гваздзёў Сяргей. Казімір Альхімовіч: Жывапісец беларускай мінуўшчыны. – Мінск: «Харвест», 2016. – 64 с.: мал. – (Серыя «100 выдатных дзеячаў беларускай культуры»).**

Казімір Альхімовіч (1840–1916) – выдатны беларускі жывапісец і графік, прадстаўнік запозненага рамантызму. Вядомы карцінамі на тэмы з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, з паўстання 1863–1864 гг., з жыцця беларускага народа ў канцы XIX – пачатку XX стст., а таксама краявідамі Беларусі.




**Тарас Анатолий. Страницы прошлого: Статьи по истории Беларуси. – Минск: Харвест, 2017. – 656 с.: илл.**

Тут сабраны навукова-папулярныя артыкулы прафесара А.Я. Тараса па розных пытаннях беларускай гісторыі, апублікаваныя ў перыяд з 2009 па 2016 год, у альманахах «Деды: дайджест публикаций о белорусской истории» і «Запісы Таварыства беларускай гісторыі імя Вацлава Ластоўскага», а таксама ў іншых выданнях. Акрамя таго, пяць артыкулаў публікуюцца ўпершыню. Артыкулы змешчаны ў адпаведнасці з храналогіяй апісаных падзеяў: старажытныя часы (5 артыкулаў); перыяд ВКЛ (6 артыкулаў); перыяд Рэчы Паспалітай (6 артыкулаў); каланіяльны перыяд (6 артыкулаў); часы БССР (16 артыкулаў). У сваёй сукупнасці яны ахопліваюць тысячу гадоў нашай гісторыі, пачынальна з эпохі першых княстваў. Яшчэ пяць артыкулаў з'яўляюцца палемічнымі.

**Сражения Великой войны 1914–1918 гг. на землях Беларуси: сборник. – Минск: Харвест, 2017. – 528 с.: ил.**

У 2014–2018 гадах міжнародная грамадскасць адзначае 100-годдзе Вялікай Еўрапейскай вайны, што ўвайшла ў гісторыю пад назвай Першай сусветнай. Яе бітвы, якія пацягнулі пагібель 10 мільёнаў людзей, адбываліся на некалькіх франтах у Еўропе і на Блізкім Усходзе. Пры гэтым Усходні фронт рассек тэрыторыю Беларусі на дзве амаль роўныя часткі. Немцы і рускія разлютавана ваявалі паміж сабой, а мясцовыя жыхары гінулі ці беглі з родных месцаў. У зборніку змешчаны публікацыі 1920–1930-х гадоў, у якіх разгледжаны асноўныя бітвы, што адбыліся на тэрыторыі Беларусі.







**Рубінчык Вольф. Выйшла кніга. – Мінск: Шах-плюс, 2017. – 124 с.**

Сёмая кніга мінскага палітолага, перакладчыка і даследчыка шахматнай мінуўшчыны цікавая найперш разнастайнасцю фактаў, часткова падзабытых, а таксама тым, што некаторыя праблемы аўтар ставіў адным з першых у Беларусі. Кнігу дапаўняюць гутаркі В. Рубінчыка з творчымі людзьмі. Для шырокага кола чытачоў... А зрэшты, як атрымаецца.




**100 словаў. Уклад. Ян Максімюк. (Бібліятэка Свабоды. XXI стагодзьдзе). – Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2017. – 346 с.: іл.**

Кніга – анталогія найлепшых тэкстаў, што з'явіліся ў рубрыцы «100 словаў» на сайце Радыё Свабода ў 2014–2016 гг. Рубрыка набыла вялікую папулярнасць сярод чытачоў сайта Свабоды, стаўшы дэмакратычнай платформай для абмену творчым досведам паміж прызнанымі аўтарамі і пачаткоўцамі.




**Вячорка Вінцук. Не сьмяшыце мае прыназоўнікі. (Бібліятэка Свабоды. XXI стагодзьдзе). – Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2017. – 316 с.: іл.**

Другая кніга нарысаў пра беларускую мову, што гучалі на хвалях і публікаваліся на сайце Радыё Свабода, пачынаючы з 2014 г. (Першая кніга выбраных тэкстаў гэтай серыі «Па-беларуску зь Вінцуком Вячоркам» выйшла ў «Бібліятэцы Свабоды» ў 2016 г.) Кніга інтрыгуе чытача невядомымі або наноў адкрытымі фактамі пра нашую мову ды яе багаццямі, нязмушана натхняючы прыгожа гаварыць па-беларуску.

Кнігі можна замовіць ці набыць па наступных адрасах:

**«Акадэмічная кніга»,** г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 72; e-mail: akademknigaminsk@mail.ru, тэл.: +375 17 292 00 52, 292 46 52, 292 50 43, **«Кніжны салон»** (вул. Калініна, 5), **«Кнігарня пісьменніка»** (вул. Казлова, 2), **«Веды»** (вул. К. Маркса, 36), **«Светач»** (пр-т Пераможцаў, 11), **«Цэнтральны кніжны»** (пр-т Незалежнасці, 19), **«Кніжная Шафа»** (пр-т Дзяржынскага, 9), **«Кнігі & кніжачкі»** (пр-т Незалежнасці, 14), **Кніжная выстава-кірмаш «Мир книг»** (пр-т Пераможцаў, 84).

А таксама ў інтэрнэт-крамах: knihi.by, prastora.by, imbryk.by, kniharnia.by, halijafy.by і e-kniga.by.

# Біблія – найлепшы бэстсэлер усіх часоў

**У Мінску ўрачыста адзначылі 500-годдзе беларускага кнігадрукавання. Каля будынка Чырвонага касцёла адбыліся навукова-асветніцкія чытанні. З прамовамі аб дзейнасці пачынальніка кнігадрукавання выступілі духоўныя асобы, даследчыкі, пісьменнікі, грамадскія дзеячы.**

Святкаванне распачаў мітрапаліт Мінскі і Магілёўскі Тадэвуш Кандрусевіч:

– Францыск Скарына прэзентаваў сваю першую кнігу 6 жніўня 1517 года, на свята Перамянення Пана. Біблія – гэта вечна жывое і дзейснае слова, дадзенае нам з мэтай нашага духоўнага перамянення.

Мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч падкрэсліў, што Біблія і сёння з'яўляецца сусветным бестсэлерам і заклікаў, каб яна стала настольнай кнігай беларусаў.

«У многіх яна ёсць у дамах, але запылілася. Прыйшоў час «адпыласосіць» Біблію гарачым імкненнем пазнаць яе. Няхай юбілей 500-годдзя кнігадрукавання і духоўна-асветніцкае свята ў гонар Францішка Скарыны стануць новым імпульсам вывучэння Бібліі, каб на яе падмурку наша краіна перамянялася і будавала шчаслівую будучыню!» – заклікаў іерарх каталіцкага касцёла.

Ігар Міхайлаў, старшыня Біблійнага Таварыства, адзначыў не толькі адукаванасць, энцыклапедычныя веды Францыска Скарыны, але і духоўную мэту, якая ім кіравала: пакінуць назаўсёды народу вечную і невычэрпную мудрасць.

Старшыня беларускага клуба «Сябрына» ў Літве Валянцін Стэх распавёў пра святкаванне 500-годдзя беларускага кнігадрукавання ў Вільні.

Доктар філалагічных навук Іван Саверчанка падкрэсліў тры асноўныя моманты значнасці скарынаўскай дзейнасці. Па-першае, выданнем Бібліі першадрукар заклікаў шанаваць Бога-Стварыцеля ўсяго існага свету і вывучаць законы, пакладзеныя ў аснову ўсяго створанага. Па-другое, ён заклікаў цаніць і развіваць асобу чалавека як вяршыню ўсяго стварэння. Па-трэцяе, ён надаў увагу развіццю талентаў асобы, каб «дасканалы быў чалавек Божы».

«Дзейнасць філосафа, асобы эпохі Адраджэння, Францыска Скарыны з'яўляецца прынцыпам гуманітарных грамадстваў усяго свету», – адзначыў Іван Саверчанка.

Паэт Алесь Разанаў, аўтар кнігі «Маем найбольшае самі», які паэтычна переастварыў тэксты прадмоваў Ф. Скарыны, падкрэсліў, што асветнік выкладаў людзям навуку Хрыстову і вучыў цаніць Боскі пачатак у чалавеку.

Пра даследаванні скарынаўскай спадчыны распавёў намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі па навуковай працы і выдавецкай дзейнасці Алесь Суша.

Старшыня ТБМ Алег Трусаў зрабіў экскурс у гістарычную эпоху Ф. Скарыны.

Як адзначылі навукоўцы, праз друкаванае слова беларусы здолелі не толькі далучыцца да інтэлектуальнай традыцыі свету, але і заявіць пра сябе. Ф. Скарына зрабіў крок да таго значэння, якое беларусы маюць у культурным сусветным развіцці.

У дольнай залі Чырвонага касцёла распачала дзейнасць выстава твораў беларускіх мастакоў на скарынаўскую тэму. Тут прадстаўлены працы Міколы Купавы, Алеся Марачкіна, Віктара Крука, Алы Губарэвіч і іншых. У мінскім Палацы мастацтваў 5 жніўня была разгорнута выстава маладзёвай і дзіцячай творчасці «Францыск Скарына – наш лёс, наша мінулае, наша будучыня».

**Эла Дзвінская, фота аўтара**



# «ДЗЕЯСЛОЎ» РАІЦЬ




**Справа: альманах. Вып. 4-2017/ Гал. рэдактар А. Наварыч. – Мінск: Белпринт, Смэлтак, 2017. – 224 с.**

Выйшаў у свет 4-ты выпуск беларуска-ўкраінскага альманаха «Справа», які выдае Таварыства ўкраінскай літаратуры пры Саюзе беларускіх пісьменнікаў. Упершыню гэта тэматычны нумар, і яго тэма: «Боль і як з ім жыць». Сярод вершаў нумару вылучаецца «Дума...», прысвечаная памяці загіблых у Кіеве ў лютым 2014 года. Аўтар, Аляксандр Грыцай, – непрафесійны літаратар, але народная манера робіць яго твор яшчэ больш шчымлівым. Сочачы за ўкраінскімі падзеямі, спачуваючы болю суседзяў, маладыя беларускія аўтары асэнсоўваюць яго: альманах знаёміць чытачоў з кранальным лістом і вершамі Уладзіміра Шыпілы, а таксама тут друкуецца псіхалагічны аповед Алеся Кіркевіча – пра тое, якую дэфармацыю церпіць асоба на вайне і што канец вайны яшчэ не канец пакутам: прыстасавацца да міру ўдаецца не ўсім абаронцам айчыны.

Таксама ў альманаху адводзіцца месца матэрыялам з беларуска-ўкраінскага памежжа (друкуюцца беларускія вершы Наталлі Сацуты, а таксама – творы на гаворках).

Як жыць з цяжарам нязробленага, непаспетага, незваротна страчанага – і як зменшыць гэты цяжар – пра тое пішуць Алесь Паплаўскі і Таня Скарынкіна.

Упершыню да беларуска-ўкраінскага дыялогу ў «Справе» далучыліся польскія аўтары. Цэнтральны твор «болевага» нумару – раман «Сонька». Яго аўтар Ігнацы Карповіч – польскі пісьменнік, які паходзіць з праваслаўнай, этнічна беларускай вёскі на Падляшшы. Друкуецца ўрывак з кнігі «Аблічча Беларусі» былога пасла Польшчы ў Беларусі Лешака Шарэпкі, прысвечаны аналізу стану беларускай мовы ў Беларусі. Гэта староннi погляд, з якім цікава азнаёміцца, бо не ўсё заўважна знутры.




**Чытанка для маленькіх – 2 / Укладальнік Анатоль Івашчанка; мастачка Дар'я Мандзік. – Мінск: Кнігазбор, 2016. – (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка». Падсерыя «Каляровы ровар»; выпуск 14). – 60 с.**

У добрай вядомай аматарам дзіцячай літаратуры серыі «Каляровы ровар» выйшаў зборнік вершаў і казак «Чытанка для маленькіх – 2». У кнізе змешчаныя і аўтарскія творы, і народныя. Тут вы знойдзеце добра вядомыя «Каток – залаты лабок», «Пшанічны каласок», «Рукавічку», а яшчэ аўтарскія казкі Янкі Брыля «Жыў-быў вожык», «Страшная казка пра страшнага звера» Івана Бурсава ды іншыя творы. Таксама ў чытанцы надрукаваныя дзіцячыя вершы беларускіх аўтараў!

На старонках кнігі ёсць вершы класікаў беларускай літаратуры Ларысы Геніюш, Артура Вольскага, Янкі Журбы, Васіля Віткі, Рыгора Барадуліна і іншых. Есць там і вершы і сучасных аўтараў: Дануты Бічэль-Загнетавай, Паўла Марціновіча, Андрэя Хадановіча, Сержука Сокалава-Воюша, Анатоля Івашчанкі і Веры Бурлак. Кніга багатая на ілюстрацыі, якія зрабіла мастачка Дар'я Мандзік, вядомая чытачам сваім праектам «Не маўчы па-беларуску!», рэалізаваным разам з кампаніяй «Будзьма беларусамі!».

«Чытанка для маленькіх» – выдатны падарунак для дзяцей дашкольнага ўзросту. Вучым родную мову з маленства!

# КАНТАКТЫ

Пададзеныя ў бюлетэні кнігі
Вы можаце замовіць непасрэдна ў выдаўцоў
па наступных кантактах:

Кніжныя серыі:
**«Бібліятэчка «Дзеяслова»,**
**«Кнігарня пісьменніка»,**
**«Бібліятэка «Бацькаўшчыны»,**
e-mail: knihanosza@gmail.com,
тэл.: +375 17 200 70 27

**«Гарадзенская бібліятэка»,**
e-mail: dzmuchavec@gmail.com,
тэл.: +375 29 133 87 17

**ІП «Логвінаў»,**
e-mail: lohvinaupress@gmail.com,
тэл.: +375 29 667 47 57

**ПУП «Кнігазбор»,**
e-mail: bkniha@tut.by,
тэл.: +375 29 772 19 14

**ІП «Уладзімір Сіўчыкаў»,**
e-mail: siuchykau@gmail.com,
тэл.: +375 44 561 05 28

**СТАА «Медысонт»,**
e-mail: medisont@gmail.com,
тэл.: +375 29 623 74 10

**Выдавецтва «Галіяфы»,**
e-mail: vish@bk.ru,
тэл.: +375 29 678 68 06

**Выдавецтва «Лімарыус»,**
e-mail: limarius@yandex.ru,
тэл.: +375 29 679 33 36

**ІП «Зміцер Колас»,**
e-mail: zkolas@gmail.com,
тэл.: +375 29 623 35 65



ІНФАРМАЦЫЙНЫ БЮЛЕТЭНЬ
Кніга наша
№ 45
жнівень, 2017
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: ГА"САЮЗ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ", МГА"ЗБС"БАЦЬКАЎШЧЫНА"

**Інфармацыйны бюлетэнь МГА «ЗБС «Бацькаўшчына» і ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў».**
Распаўсюджваецца на правах унутранай дакументацыі.
Наклад 299 асобнікаў. № 45 25.10.2017.
Адказны за нумар – Алесь Сачанка.
Адрас рэдакцыі: г. Мінск, вул. Кузьмы Чорнага, 31-906, 220012, тэл./факс: (+375 17) 200 70 27.
E-mail: knihanosza@gmail.com